УДК 947.6 (411.6)

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ РСДРП НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ПАДЧАС ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ (ЖНІВЕНЬ 1914 – ЛЮТЫ 1917 гг.)

***М.В. ЦУБА***
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Падчас Першай сусветнай вайны ў няпростым становішчы аказаліся апазіцыйныя ўраду партыі і рухі. Рэчаіснасць паставіла перад імі складаны выбар: садзейнічаць паражэнню ў вайне свайму ўнутранаму ворагу – самадзяржаўю, і тым самым фактычна прыняць іншаземнае нашэсце, што вяло да страты незалежнасці; ці ў ваенны час падтрымаць урад і выступіць супраць знешняга ворага. Усе партыі і рухі ў пераважнай большасці, за выключэннем бальшавіцкай Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), выказаліся за апошняе. Такая пазіцыя бальшавіцкай партыі ў некаторай ступені дала падставу расійскаму ўраду, які разлічваў у ходзе вайны не толькі на далучэнне да Расійскай імперыі новых тэрыторый, але і меў на мэце прадухіленне пагрозы рэвалюцыі і расправу з палітычнымі праціўнікамі, да правядзення рэпрэсій. Праведзенныя ўладамі на пачатку вайны масавыя рэпрэсіі супраць апазіцыйных сіл прывялі да таго, што працягваючыя дзейнасць некаторыя нешматлікія і малаколькасныя партыі і арганізацыі не маглі аказваць рашаючага уплыву на грамадска-палітычнае жыццё. Аднак з цягам часу грамадска-палітычныя арганізацыі змаглі прыстасавацца да ўмоў вайны, вядучы працу ў патрэбным для сябе накірунку. У дадатак расло сацыяльнае і грамадскае напружанне ва ўсіх слаях насельніцтва, выклікане паражэннямі на фронце і няздольнасцю самадзяржаўя прадухіліць эканамічную разруху ў тыле. У гэтых абставінах лёс самадзяржаўя быў вырашаны як дзякуючы дзейнасці грамадска-палітычных арганізацый, так і салдацкімі масамі ў ходзе Лютаўскай рэвалюцыі.

**Асноўная частка.** На пачатку вайны РСДРП была адарванай ад свайго кіраўніцтва, якое на гэты час знаходзілася ў эміграцыі. Аднак своечасова, у сувязі з такімі абставінамі, ролю Расійскага бюро ЦК у першыя месяцы вайны пачала выконваць бальшавіцкая фракцыя IV Дзяржаўнай думы на чале з членамі ЦК РСДРП – А.Е. Бадаевым, Г.І. Пятроўскім, М.К. Муранавым, Ф.Н. Самойлавым, Н.Р. Шагавым і Р.В. Маліноўскім. Аб гэтым красамоўна сведчыць даклад Магілёўскай губернскай жандармерыі аб становішчы ў снежні 1914 г. у Палескай арганізацыі РСДРП, дзе сказана, што «Гомельскі камітэт РСДРП да пачатку цякучай вайны праз свайго сакратара меў сувязі непасрэдна з ЦК за мяжой, а затым – да арышту члена Дзяржаўнай думы Бадаева – з апошнім» [1].

На пачатак вайны Палеская арганізацыя РСДРП у Гомелі адрэагавала «выпускам лістовак, якія растлумачвалі рабочым, у чыіх інтарэсах вядзецца вайна» [2]. Але ўжо 15 ліпеня 1914 г. паліцыя зрабіла налёт на партыйны камітэт гэтай арганізацыі – арыштавала пяць чалавек, канфіскавала гектографы, адбіткі лістовак і іншую палітычную літаратуру. Былі таксама разгромлены партыйныя арганізацыі і праўдзісцкія групы ў Мінску, Магілёве, Віцебску, Брэсце, Слуцку і іншых гарадах [3, с. 597]. Пасля гэтага рэвалюцыйная дзейнасць арганізацый РСДРП на Беларусі на працягу некалькі месяцаў была значна аслаблена. Сёння цяжка вызначыць, ці ўнёс у гэта сваю лепту Р.В. Маліноўскі, які быў не толькі кіраўніком бальшавіцкай фракцыі ў Думе і членам ЦК партыі, але ж яшчэ, як высвятліцца пазней, правакатарам і агентам паліцыі. Вядома, што Маліноўскі выдаў шэраг вядомых рэвалюцыянераў, перадаў у дэпартамент паліцыі архіў думскай фракцыі бальшавікоў і спісак праўдзісцкіх груп [4, с. 98–99].

Значныя разыходжанні падчас пачаўшайся вайны меліся сярод бальшавіцкіх лідэраў у адносінах да нацыянальнага пытання. Напрыклад, Бухарын, Пятакоў, упэўненыя ў хуткім крушэнні капіталістычнай сістэмы, адносіліся да ленінскага лозунга «самавызначэння нацый» як да страціўшага сваю сілу і толькі раз’ядноючага пралетарыят розных нацый. Ленін жа перад вайной і падчас вайны настойваў на захаванні гэтага лозунга ў праграме партый і тлумачыў яго як права нацый на аддзяленне і стварэнне самастойных дзяржаў. Акрамя таго, ён даказваў, што паражэнне царызма – «самага рэакцыйнага і варварскага ўрада» – у вайне будзе найменшым злом з пункту гледжання працоўных усіх народаў Расіі. Ленін таксама быў упэўнены, што Расійская імперыя стаіць на парозе буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і ў сувязі з гэтым здольная паскорыць сусветную пралетарскую рэвалюцыю [5, с. 27].

ПолесГУ

Асноўным жа пытаннем унутрыпартыйнага характару, як для ўсіх партый ў гэты перыяд, так і для РСДРП, было высвятленне сваіх адносін да пачаўшайся Першай сусветнай вайны. Вайна прывяла да значных пераменаў унутры партыі і да перагрупоўкі сіл. Рознагалоссі выйшлі на пярэдні план. У выніку былі створаны тры асноўных накірункі: патрыятычнае, пацыфісцкае і рэвалюцыйна-інтэрнацыяналісцкае.

РСДРП нельга было назваць адзінай партыяй і таму, што нават у стане бальшавікоў меліся наконт вайны розныя падыходы. Тым больш гэтыя падыходы розніліся сярод меншавікоў, якія на беларускіх губернях падчас вайны па-ранейшаму працягвалі супольна з бальшавікамі ўваходзіць у склад арганізацый РСДРП. Напрыклад, Г. Плеханаў, апеліруючы апелюючы к любові да Айчыны і патрыятычнасці, заклікаў сваіх прыхільнікаў у партыі змагацца за перамогу ў вайне чаго б гэта не каштавала.

Іншага погляду прытрымліваўся У. Ленін. У сваёй працы «Вайна і расійская сацыял-дэмакратыя» ён абвясціў лозунг «рэвалюцыйнага паражэнства». Гэты лозунг зыходзіў з інтарэсаў сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, яго сутнасць заключалася ў ідэі паражэння ў вайне «свайго» урада. Па меркаванню Леніна, паражэнні буржуазных урадаў прывядуць іх да палітычнага банкруцтва і адкрыюць выдатныя магчымасці для перамогі сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Спыненне вайны Ленін звязваў не з давядзеннем яе да пераможнага канца, а з сацыялістычнай рэвалюцыяй, якая павінна адбыцца ў сувязі з «пераўтварэннем імперыялістычнай вайны ў грамадзянскую», супраць эксплуататарскіх класаў. «Імперыялістычнай» вайна называлася Леніным, але далёка не ўсімі членамі бальшавіцкай партыі. Для многіх іншых гэта была вайна Айчынная. А што значыць пераўтварыць вайну імперыялістычную ў вайну грамадзянскую? Гэта наперш азначала развязаць бойню сярод насельніцтва Расійскай імперыі і прынесці велізарныя людскія і матэрыяльныя страты свайму народу. Вышэй адзначаны лозунг Леніна амаль не быў падтрыманы сацыял-дэмакратыяй Заходніх краін. Ва многім па гэтаму дадзены лозунг, абвешчаны У.І.Леніным у 1914 г., ігнараваўся і ў Расійскай імперыі, ён закранаў патрыятычныя пачуцці людзей і не ўспрымаўся не толькі шырокімі масамі, але і многімі рэвалюцыянерамі, адхіляўшымі шлях да рэвалюцыі ідучы праз нацыянальнае прыніжэнне як натуральны вынік ваенных паражэнняў [6, с.142].

Акрамя таго, пры жаданні, гэтаму лозунгу можна было даць тлумачэнне, як заклік да канкрэтных практычных дзеянняў на карысць Германіі. Менавіта Германія ў 1914–1915 гг. прыкладвала значныя намаганні ў ваеннай і дыпламатычнай сферах, дамагаючыся заключэння сепаратнага міру з Расійскай імперыяй. Так як расійскі ўрад адказваўся ісці на падобныя перамовы, германскімі кіруючымі коламі было вырашана актывізаваць дзейнасць нямецкіх спецслужб, якія павінны былі вывесці Расію з вайны пры дапамозе разлажэння яе тыла. Асаблівая ўвага пры гэтым удзялялася рабоце з партыямі і рухамі, якія былі апазіцыйна настроеныя ў адносінах да царскага ўрада. Адной з такіх партый была РСДРП, значная частка кіраўніцтва якой на чале з Леніным з самага пачатку вайны выступала пад лозунгам «паражэння свайго ўрада» [7, с. 1]. Калі дадаць да гэтага, што змест «рэвалюцыйнага паражэнства» быў раскрыты У.І. Леніным недастаткова, то не прыходзіцца здзіўляцца, што нават у частцы бальшавікоў дадзены лозунг асаблівага захаплення не выклікаў. Нельга у сувязі з гэтым прызнаць выпадковым, што ў лістоўках бальшавіцкіх камітэтаў, якія распаўсюджваліся ў 1914–1917 гг. па Расійскай імперыі, гэтага лозунга проста не было [6, с. 132–143].

Тым больш не выклікаў ён захаплення ў меншавікоў, і калі на пачатку вайны яны разам з бальшавікамі ў Дзяржаўнай думе заявілі аб грабежніцкім, несправядлівым характары вайны з абодвух бакоў, то далей у радах РСДРП узмацніўся працэс размежавання, у ходзе якога меншавікі-інтэрнацыялісты ў цэлым падтрымалі бальшавіцкія лозунгі, а большая частка меншавікоў выступіла з абарончых, цэнтрысцкіх пазіцый.

Што датычыцца бальшавікоў, то хутчэй усяго яны свядома ішлі толькі на радыкальныя меры, каб найхутчэй прыблізіць рэвалюцыю, а таму цярпець не маглі тых поглядаў, якія адрозніваліся ад іхніх, а таксама прапаноў альтэрнатыўных шляхоў развіцця грамадства, што выстаўляліся і прапагандаваліся іншымі апазіцыйнымі да ўрада партыямі.

Меншавікі ж наадварот імкнуліся да расшырэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, а таксама былі за стварэнне апазіцыйна-рэвалюцыйнага блоку, дзе вялікую ролю адводзілі і ліберальным дэмакратам. Акрамя таго, яны аддавалі прыярытэт мірным метадам барацьбы і легальным формам агітацыі перад гвалтоўнымі і нелегальнымі [8, с. 33].

Але на Беларусі гэтая розніца поглядаў амаль не адчувалася, і нешматлікія арганізацыі РСДРП, нягледзячы на пэўныя ўнутраныя рознагалоссі, заставаліся ў асноўным адзінымі.

Полесгу

Бясспрэчна, што ваенна-палітычныя рэпрэсіі, масавыя мабілізацыі кадравых рабочых значна ўскладнялі грамадска-палітычную дзейнасць арганізацый РСДРП сярод рабочага класа. Аднак нават у пачатковы перыяд вайны іх дзейнасць, у тым ліку на беларускіх землях, не спынілася.

У снежні 1914 г. быў адноўлены Палескі камітэт РСДРП. Вядома, што члены дадзенага камітэта напрыканцы 1914 г. вялі агітацыйную працу сярод гомельскіх рабочых, выпускалі і распаўсюджвалі лістоўкі, у якіх выкрывалася імперыялістычная сутнасць вайны. Акрамя таго, у гэты час імі былі наладжана сувязь з Петраградскім камітэтам бальшавікоў і Кіеўскай партыйнай арганізацыяй, створаны партыйныя групы на заводзе «Арсенал» і ў майстэрнях Лібава-Роменскай чыгункі [9, с. 206].

З 1915 г. дзейнасць арганізацый РСДРП пастулова набірае моц. Па заключэнню жандарскага дэпартамента г. Дзвінска, група РСДРП распаўсюджвала тут 17 сакавіка 1915 г. «злачынныя заклікі пад загалоўкам «Да салдатаў» выдавецтва ЦК РСДРП і сацыял-дэмакратыі Латышскага краю» [10]. Былі зроблены налёты паліцыі на членаў апазіцыйных да ўрада партый і ў горадзе Мінску, аб чым з жандарскага паведамлення даведваемся, што «ротмістр Паноў разгледзяў рэчы, забраныя ў ходзе вобыска 30 красавіка 1915 г. у Фіксы М.Б. Было пастаноўлена: газету «Іскра» за 2 гады і брашуру В. Медэма – «Сацыял-дэмакратыя і нацыянальнае пытанне» канфіскаваць, так як яны носяць рэвалюцыйны змест» [11]. Аднак гэта не перашкодзіла ў 1915 годзе аднавіць сваю дзейнасць арганізацыям РСДРП Мінска: спачатку летам гэтага года тут узнікае сацыял-дэмакратычная група латышоў, у якую ўваходзілі К.І. Ландар, П.П. Цэльмін, Л.П. Разавускі і інш. [12, с. 205]. 17 сакавіка 1915 г. каля варот станцыі Таварная ў Мінску паліцыя знайшла мноства экземпляраў зварота «Да салдат», які быў выпушчаны ЦК РСДРП Латышскага краю. 6 красавіка ў горадзе зноў былі раскіданы звароты «Да салдат». Праз два дні вялікую колькасць гэтых лістовак адшукалі ў казармах 375–й пяхотнай Віцебскай дружыны ў Мінску [13, с. 184], а затым у канцы 1915 г. была яшчэ створана бальшавіцкая група ў гаспадарчым аддзеле Земгора [3, с. 613].

Акрамя таго аднаўляюць сваю дзейнасць сацыял-дэмакратычныя групы ў Оршы, Дзвінску і Віцебску. У маі 1915 г. прадстаўнік віцебскай арганізацыі РСДРП удзельнічаў у рабоце нарады членаў маскоўскай абласной партыйнай арганізацыі, дзе прысутнічалі прадстаўнікі Петраграда, Масквы, Самары, Тулы. Тут абмяркоўваўся стан партыйнай работы на месцах у прыняўшых удзел у нарадзе арганізацыях і адносіны на дадзеным этапе да вайны [14, с. 34].

З мэтай навязвання свайго светапогляду на насельніцтва прыфрантавых беларускіх губерняў і салдат Заходняга фронту, члены мясцовых арганізацый РСДРП дастаўлялі сюды і распаўсюджвалі антыўрадавыя лістоўкі – «Праўда аб вайне», «Да народа», «Да салдатаў» і іншыя. У чэрвені 1916 г. з Петраграда на Беларусь у шматлікай колькасці экзэмпляраў была завезена пракламацыя ЦК РСДРП «Стачачная барацьба і задача моманту», якая была распаўсюджана сярод насельніцтва Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Гэтая лістоўка растлумачвала, што ў дадзеных умовах «усялякі рух пралетарыята павінен немінуча выліцца ў пратэст супраць вайны» [15, с. 7]. Таксама з паведамлення слуцкага жандарскага ўпраўлення ад 15 чэрвеня 1916 г. вынікае, што ў горадзе Нясвіжы «ў Нясвіжскім малітвенным доме знойдзена 49 экзэмпляраў ваенна-рэвалюцыйнага органа абласнога саюза Літвы і Беларусі РСДРП «Салдацкае жыццё» [16]. А 14 снежня 1916 г. жандармерыяй «на Саборнай плошчы ў горадзе Мінску былі знойдзены дзве пракламацыі пад загалоўкам «Таварышы», выступаючыя супраць вайны і заклікаючыя  ў сувязі з адказам на патрабаванні салдат павярнуць штыкі супраць свайго ўрада» [17].

Разам з прывезенымі распаўсюджваліся такія пракламацыі і лістоўкі, якія друкаваліся і на Беларусі. Напрыклад, у канцы 1916 г. з'явілася пракламацыя, выдадзеная Гомельскім Палескім камітэтам РСДРП, у якой гаварылася: «Уся краіна стогне пад уціскам самадзяржаўя. Трэці год льюцца патокі чалавечай крыві, гінуць мільёны рабочых і сялян. Краіна без хлеба, без паліва, без адзення – вось да чаго прывяло панаванне прыгонніцкага самадзяржаўя. Смерць у акопах, смерць у царскіх казематах – вось што нас чакае. Дзе ж выйсце з такога тупіка? Выйсце ў барацьбе за зяржэнне царскага самаўладства. Далоў цара, далоў вайну!» [3, с. 611].

Ва ўмовах цяжкай вайны, галечы, беднасці хутка расло незадавальненне і адбывалася рэвалюцыянізацыя настрояў народных мас. У выніку палітычная агітацыя бальшавіцкіх арганізацый мела пэўны поспех, падтрымку і сярод часткі беларускага сялянства.

Згодна з паведамленнем жандармаў на беларускіх землях сярод сялянскага насельніцтва вялася «шкодная агітацыя, звязаная з ваеннымі абставінамі і накіраваная на падрыў улады ўрада». У Мінскай, Гродзенскай губернях, а таксама на Лідшчыне Віленскай губерні ў маі 1915 года распаўсюджваліся пракламацыі РСДРП, якія заклікалі: «Далоў вайну, далоў царскую манархію, няхай жыве рэвалюцыя!» [18, с. 231].



Полесгу

Аднак адной з самых галоўных сваіх задач арганізацыі РСДРП на прыфрантавой Беларусі лічылі агітацыйную працу сярод салдат. Асноўнымі лозунгамі масавай агітацыі ў 1915–1916 гг. былі барацьба са здрадай царскіх улад і вярхоўнага камандавання, з растучай эканамічнай разрухай, за падтрымку бастуючых рабочых і сялян і іншыя. Паражэнні расійскіх войск Заходняга фронту летам 1915 г. выклікалі хваляванні ў салдацкай масе. У гэты час паток падпольнай літаратуры ў армію значна павялічыўся. Члены РСДРП выкарыстоўвалі для дадзенай мэты ўсемагчымыя гурткі, якія займаліся зборам і пасылкай на фронт падарункаў, укладваючы ў пасылаемыя рэчы рэвалюцыйныя лістоўкі. Адна з такіх лістовак Пецярбурскага камітэта РСДРП, распаўсюджаная летам 1915 г. на тэрыторыі Гродзенскай губерні пад назвай «Таварышы рабочыя і салдаты», заканчвалася заклікамі: «Далоў вайну!», «Няхай жыве рэвалюцыя!», «Няхай жыве РСДРП!», «Няхай жыве аб'яднанне салдат і рабочых!» [19, с. 85].

На тэрыторыі беларускіх губерняў размяшчаўся Заходні фронт (паўтара мільёна салдат). Тут праз мясцовыя партыйныя арганізацыі падтрымлівалася сувязь петраградскіх і маскоўскіх партыйных груп РСДРП з кіраўніцтвам гэтай партыі, што знаходзілася ў эміграцыі. Гэтым абставінам надавалася вялікае значэнне, і на Беларусь накіроўваліся найбольш вопытныя партыйныя кіраўнікі.

Значна ажывіў рэвалюцыйную працу сярод салдацкіх мас Заходняга фронта М.В. Фрунзе, які па заданню ЦК РСДРП прыехаў на Беларусь ў красавіку 1916 года. Пад прозвішчам Міхайлава ён уладкаваўся на службу ў Мінск ў камітэт Усерасійскага земскага саюза. Фрунзе разгарнуў актыўную работу па стварэнню бальшавіцкіх арганізацый як у вайсковых фарміраваннях, так і сярод рабочых і сялян. Праца ў земскім саюзе, установы якога былі параскіданы па ўсіх беларускіх губернях, у тылу і на фронце, давала добрыя магчымасці для падпольнай рэвалюцыйнай дзейнасці. Фрунзе развозіў і распаўсюджваў рэвалюцыйную літаратуру, устанаўліваў сувязі з рабочымі, сялянамі, салдатамі, шматразова праводзіў нелегальныя сходы і гутаркі ў вайсковых гарнізонах Мінска, Лунінца, Івянца і іншых гарадоў і мястэчкаў [18, с. 230].

Актыўную рэвалюцыйную работу ў вайсковых фарміраваннях Заходняга фронту праводзіў, адзін з кіраўнікоў бальшавіцкіх арганізацый на Беларусі Ф. Мяснікоў. Будучы мабілізаваным у армію з самага пачатку вайны, ён, знаходзячыся на Заходнім фронце, вёў актыўную прабальшавіцкую агітацыю сярод салдат і ў 1916 годзе стварыў у сваёй вайскавай часці бальшавіцкую арганізацыю [18, с. 230].

Патрэбна адзначыць, што ў расійскіх вайсковых фарміраваннях, размешчаных на тэрыторыі беларускіх губерняў, мелі месца утварэнні сацыял-дэмакратычных груп і ў больш ранні час. Напрыклад, была створана такая група пры вайсковай часці ў Лунінцы, якую ўзначаліў І.Я.Любімаў. Група падтрымлівала сувязі з Масквой, адкуль атрымлівала рэвалюцыйную літаратуру. Яе дзейнасць не абмяжоўвалася працай сярод салдат. Члены групы наладжвалі сувязі з актыўнымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнага руху, прыцягваючы іх у свае рады. Характэрным у гэтым плане з'яўляецца прыклад з С.В. Федаровічам, які ў снежні 1916 г. пасля чатырохгадовага турэмнага зняволення за палітычную агітацыю сярод сялян вярнуўся ў родную вёску Грычынавічы Мазырскага павета і ўжо праз некалькі дзён наладзіў сувязі з Лунінецкай арганізацыяй і быў залічаны ў яе склад [20, с. 156–157].

У 1916 годзе салдаты Кнорын, Крывашэін, Панамароў арганізоўваюць ячэйку РСДРП у 32–м эвакапункце Мінска [13 с. 184]. Падобныя групы былі створаны ў вайсковых часцях Нясвіжа на чале з І.К. Ксенафонтавым, а таксама ў мястэчку Мір і ў Маладзечна [19, с. 83]. Вялася пэўная палітычная прапаганда сярод салдат Заходняга фронту такімі членамі РСДРП, як Б.П. Позерн, С.Г.Магілёўскі, І.Я. Альбегаў, В.В. Фамін. Усяго ў вайсковых фарміраваннях Заходняга фронту к пачатку 1917 года было створана болей 30 арганізацый РСДРП бальшавіцкага накірунку [9, с.206].

**Заключэнне.** Нягледзячы на рэпрэсіі, раз'яднанасць у поглядах, адсутнасць адзінага арганізацыйнага цэнтра, усё ж арганізацыі РСДРП у Беларусі і Заходнім фронце вялі істотную рэвалюцыйную работу сярод салдат, рабочых, сялян па растлумачванню, з свайго пункту гледжання, прычын вайны, рыхтавалі сілы для звяржэння самадзяржаўя. У выніку вайскавыя фарміраванні Заходняга фронту паступова разлагаліся, праяўляючы няздольнасць да вядзення баявых дзеянняў. Усё больш адчай і стомленасць ад вайны, якая не прынесла хуткай перамогі, адчувалі народныя масы прыфрантавых губерняў.

Агітуючы грамадскасць за неадкладнае спыненне ўсім надакучыўшай вайны і заключэнне міру, арганізацыі РСДРП заваёўвалі ўсё больш давер сярод салдацкіх мас, пэўнай часткі рабочага класа і сялянства. Прытрымліваючыся такой тактыкі яны змаглі перацягнуць на свой бок значныя ра-



Полесгу

валюцыйныя сілы, што дало ім надзейны шанс у будучым перамагчы ў партыйнай барацьбе і ўзяць уладу ў свае рукі.


**ЛІТАРАТУРА**

1. НАРБ – Ф. 60. – Воп. 3. – С. 113. – Л. 2.
2. НАРБ – Ф. 60. – Воп. 3. – С. 113. – Л. 11.
3. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. Т. 2. Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.). – 688 с.
4. Жарава, Л.Н. История Отечества,1900–1940 гг. / Л.Н. Жарава, И.А. Мишина. – М. : Просвещение, 1992. – 335 с.
5. Вернигоров, В.И. Политические партии и общественные движения в России и Беларуси: вторая половина XIX – первая треть XX века: Пособие / В.И. Вернигоров. – Минск : Амалфея, 2001. – 176 с.
6. Первая мировая война: дискуссионные проблемы истории. – М. : Наука, 1994. – 304 с.
7. Брестский мир 1918 г. и Беларусь. Режим доступа : http:// beljournal.by.ru/ 1999/2/8.shtml?extract=1107524280. – Дата доступа : 15. 09.2011.
8. Алпеев, А.П. Политическая история XX века: Учебно–методическое пособие для самостоятельной работы студентов / А.Н. Алпеев [и др.]; Под ред. В.К. Коршука. – Минск : БГУ, 1990. – 131 с.
9. История Белорусской ССР. Минск : Наука и техника, 1977. – 632с.
10. НАРБ. – Ф. 705. Воп.1. С. 15. – Л. 119.
11. НАРБ. – Ф. 705. Воп.1. С. 15. – Л. 256.
12. Агурский, С. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917) / С. Агурский – Минск : Белгиз, 1928. – 348 с.
13. Тугай, У.В. Латышскі этнас у сацыяльна–эканамічным і культурным жыцці Беларусі: Манагр. / Пад навук. рэд. праф. В.М. Фаміна / У.В. Тугай. – Мінск : БДПУ, 2003. – 305 с.
14. Кукушкин, С. Московские большевики в годы первой мировой войны и Февральской революции./ С. Кукушкин. – М. : Московский рабочий,1963. – 191 с.
15. Саладкоў, Д.Я. Бальшавікі Беларусі ў перыяд лютаўскай буржуазна–дэмакратычнай рэвалюцыі / Д.Я. Саладкоў. – Мінск : Полымя, 1957. – 92 с.
16. НАРБ – Ф. 705. – Воп. 1. – С. 47. Л. 171–174.
17. НАРБ – Ф. 705. – Воп. 1. – С. 47. Л. 237–239.
18. Липинский, Л.П. Крестьянское движение в Белоруссии в период между двумя революциями (июнь 1907 – февраль 1917 гг.) / Л.П. Липинский, Е.П. Лукьянов. – Минск : Наука и техника, 1964. – 260 с.
19. Савицкий, Э.М. Революционное движение в Белоруссии (август 1914 – февраль 1917гг) / Э.М. Савицкий. – Минск : Наука и техника, 1981. – 182 с.
20. Цуба, М.В. Грамадска–палітычнае жыццё на Беларусі з пачатку Першай сусветнай вайны да Лютаўскай рэвалюцыі (жнівень 1914 – люты 1917гг.) Матэрыялы да курса «Гісторыя Беларусі» / М.В. Цуба. – Мінск: Арты–Фэкс. – 231с.


## SOCIAL AND POLITICAL ACTIVITIES OF RSDLP IN BELARUS DURING THE WORLD WAR I (AUGUST, 1914 – FEBRUARY, 1917)


***M.V. TSUBA***



***Summary***

Peculiarities and activity trends of Bolshevik organizations in Belarus from the beginning of World War I to the February Revolution of 1917 are investigated. Much attention is paid to the conditions and circumstances which took place during the war on the Belarusian territory and exerted much influence on the activities of Bolshevik party organizations.



© Цуба М.В.



*Поступила в редакцию 1октября 2011*



ПолесГУ